ЦІКАВАЯ ГІСТОРЫЯ

# ТАК ПАЧЫНАЛАСЯ УЛА

**Аграгарадок Бешанковіцкага раёна ў часы Рэчы Паспалітай быў горадам...**

## Непаразуменне і блытаніна

**Старшы навуковы супрацоўнік Навукова-тэхналагічнага парка БНТУ «Палітэхнік» Максім МАКАРАЎ** кажа, што Ула, як і Сураж, пра які мы расказалі, мае ўнікальную гісторыю з'яўлення. Гэта адзін з нямногіх гарадоў Беларусі, якія з'явіліся дзякуючы не рамёствам і гандлю — яны былі пабудаваны ў ваенных мэтах.

— У гістарычнай літаратуры звычайна сцвярджаецца, што Ула ўзнікла яшчэ ў XV стагоддзі. Аднак гэта не так. Сучасную Улу нельга блытаць з прыватным мястэчкам пад той жа назвай, якое існавала ў першай палове XVI стагоддзя прыблізна за 35 кіламетраў на поўдзень. Да пачатку ж 1560-х гадоў на вельмі зручным месцы — пры сутоках суднаходных рэк Улы і Заходняй Дзвіны — не было ні замка, ні гарадскога паселішча, — расказвае Максім Макараў.

У лютым 1563 года войскі цара Івана IV захапілі Полацк, і ў выніку разбурылі сістэму абароны ВКЛ на землях Падзвіння. Улады дзяржавы мусілі спешна распачаць узвядзенне шэрагу новых умацаванняў.

Пільную ўвагу звярнулі на мыс пры ўпадзенні Улы ў Дзвіну. Ён набыў выключнае стратэгічнае значэнне. Яшчэ да прыходу рускіх па распараджэнні караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста сюды накіравалі будаўнікоў.

Войскі Маскоўскай дзяржавы знішчылі недабудаваны замак і ў хуткім часе пачалі ўзводзіць свае ўмацаванні. Летам 1567-га будаўнічыя работы яшчэ працягваліся. Войскі ВКЛ не раз спрабавалі адбіць Улу. У лютым—сакавіку 1568-га замак тры тыдні безвынікова асаджалі воіны жамойцкага старасты Яна Геранімавіча Хадкевіча. Толькі ў канцы жніўня войскі гетмана, князя Рамана Сангушкі штурмам захапілі Улу і спалілі яе.



План асады Улы войскамі ВКЛ, люты—сакавік 1568 года.

## Прывабныя ўмовы для мяшчан

Пасля пачалі адбудоўваць замак, а да сярэдзіны 1570-га быў заснаваны і горад. Там сяліліся ў асноўным ацалелыя жыхары навакольных вёсак. Стымуляванне для развіцця горада вялося па апрабаванай на тэрыторыі ВКЛ схеме. Жыгімонт Аўгуст вясной 1571 года часова вызваліў мяшчан ад аплаты мытных збораў, ад падатку з вытворчасці і продажу алкагольных напояў.

Падчас Лівонскай вайны навакольлі Улы былі моцна спустошаны. І калі Жыгімонт Аўгуст прызначыў на пасаду «дзяржаўцы» ульскага князя Канстанціна Лукомскага, ён дадаткова распарадзіўся, каб той штогод атрымліваў з дзяржаўнай казны сто коп грошаў. «Мэру» папросту не было з каго збіраць падаткі і атрымліваць судовыя аплаты...

— Няспынныя баявыя дзеянні і пагроза знішчэння ўносілі істотныя карэктывы ў жыццёвы ўклад насельніцтва. Пры ціпльных магчымасцях казны ВКЛ уладам цяжка было пастаянна ўтрымліваць тут значны наёмны гарнізон. І яны паспрабавалі вырашыць пытанне забеспячэння абараназдольнасці Улы іншым шляхам, які быў ужо апрабаваны ў Віцебску і Суражы. 26 студзеня 1577 года кароль польскі і вялікі князь літоўскі Стэфан Баторый сваім прывілеем пашырыў на Улу сістэму гарадскога права, якая ў другой палове XVI стагоддзя ўжо склалася і функцыянавала ў Віцебску, — працягвае гісторык.



Праект Ульскага замка, створаны ў Італіі, канец 1568 года.

Асноўнай павіннасцю ульскіх мяшчан, як і віцебскіх, стала нясенне прэстыжнай коннай вайсковай службы. Падаткі яны не плацілі. Акрамя таго, мяшчане Улы атрымалі права на выбар войта, бязмытны гандаль, правядзенне двух кірмашоў у год. Сярод прывілеяў было і вольнае распараджэнне рухомай і нерухомай маёмасцю. Як і свабода выбару месца жыхарства на тэрыторыі ВКЛ. Ім таксама былі перададзены землі на адлегласці мілі вакол Ульскага замка.

## І вежачка на мысе

Захаваліся дзве графічныя выявы Улы перыяду Лівонскай вайны. На першай з іх намалявана магутная драўляная крэпасць, збудаваная войскамі цара Івана IV і пазней знішчаная воінамі Рамана Сангушкі. Другая — праект замка з 9 бастэямі (вежамі), створаны па замове ўладаў ВКЛ у канцы 1568 года ў Італіі.

— Згаданы італьянскі праект так ніколі і не быў рэалізаваны ў поўным аб'ёме. Як сведчыць інвентар Улы ад 8 ліпеня 1581 года, праз 12 гадоў пасля стварэння праекта вал і бастэі існавалі толькі на вузкім адрэзку паміж рэкамі Улай і Дзвіной. З усіх астатніх бакоў замак быў агароджаны часткова звычайнымі зрубамі — «гароднямі». А часткова — нават прымітыўным вастраколам. На мысе пры зліцці рэк стаяла вежачка, — удакладняе даследчык.

Пасля заканчэння Лівонскай вайны Ула страціла стратэгічнае значэнне. Колькасць насельніцтва значна зменшылася. А ў першай палове XVII стагоддзя паселішча ўвогуле трапіла ў прыватныя рукі. 31 сакавіка 1648 года браслаўскі земскі суддзя Себасцьян Мірскі, уладар Улы, атрымаў ад караля польскага і вялікага князя літоўскага Уладзіслава Вазы прывілей на магдэбургскае права для свайго мястэчка. Дакумент прадугледжваў перавод насельніцтва Улы пад юрысдыкцыю войта ці лентвойта, якога прызначаў гаспадар паселішча.

Акрамя гэтага, кароль дазволіў Мірскаму, у выпадку, калі ён гэтага пажадае, стварыць пры намесніку — войце — магістрат... Такім чынам, у 1648 годзе мяшчанам Улы было нададзена магдэбургскае права. Аднак правы на самакіраванне, удзел у вырашэнні ўласнага лёсу праз сваіх прадстаўнікоў яны фактычна не атрымалі. Гэта яскрава сведчыць пра тое, што «магдэбургскае права» і «гарадское самакіраванне» не зусім адно і тое ж...

**Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

СПАДЧЫНА

# ВУШКІ — З САЛА, ВОЧКІ — З ЧАРНІЦ

## Галоўнае — адкусіць хвост

**Перадпіліпаўскаму традыцыйнаму ігрышчу «Ката пячы» з Дзяржыншчыны будзе нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці**

Такое рашэнне прынята на пасяджэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны, што прайшло ў Міністэрстве культуры.

Напярэдадні перадкаляднага, або Піліпаўскага, посту нашы продкі стараліся ўволю павесяліцца, каб не сумна было бавіць доўгія зімнія вечары, у якія царквой забараняецца танцаваць ды гучна святкаваць. Таму ў розных рэгіёнах краіны і сёння прыводзяць згадкі пра традыцыйныя ігрышчы, што ладзяцца менавіта ў гэты час. Запускі, вячоркі, проста танцы ды спевы ў адной з вясковых хат. А вось у Скірмантаве, што на Дзяржыншчыне, у жывым бытаванні захаваўся адметны абрад «Ката пячы», што ладзіцца 27 лістапада. Па сведчанні сталых жыхароў вёскі, гульня існавала ў многіх вёсках гэтага рэгіёна яшчэ ў перыяд маладосці іх бацькоў. Ды і самі яны ў маладосці з задавальненнем прымалі ўдзел у ігрышчах. Як бачым, жыве «Кот» і сёння.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У гэты вечар жанатыя і нежанатыя пары збіраюцца на вясёлую вечарыну. Галоўнай падзеяй ігрышча з'яўляецца выраб фігуры «ката» са спецыяльна выпечаных булак пэўнай формы. Яны адмысловым чынам злучаюцца паміж сабой. Галава аздабляецца вушкамі з сала, вочкамі з чарніц, далучаецца хвост са свойскай каўбасы. Выробленага такім чынам «звера» пад музыку і спевы выносяць у цэнтр хаты і прывязваюць да столі.

Затым — жартоўнае спаборніцтва паміж удзельнікамі, хто якую частку фігуры здолее адкусіць. Так, кожны па чарзе «едзе на качарзе» да «ката» і падскоквае, імкнучыся ўхапіць зубамі кавалак. Пры гэтым неабходна пераадолець перашкоды, якія ствараюць іншыя ўдзельнікі, і выканаць пэўныя ўмовы (не ўсміхацца, не чапаць ката рукамі і інш.). Тым, хто не справіўся, атрымліваюць жартоўнае заданні. Пераможцам лічыцца той, хто адкусіў хвост, пасля чаго «ката» дзеляць паміж усімі прысутнымі.

Уся гульня суправаджаецца традыцыйнымі песнямі, прыпеўкамі, танцамі пад гармонік, жартоўнымі гульнямі, анекдотамі, вячэрай з пачастункамі, якія ўдзельнікі прыносяць з сабой. Цікава, што ў гэты вечар ядуць толькі падкрэслена тлустыя і багатыя стравы, бо ўжо на наступны дзень пачынаецца строгі пост.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 25 ліпеня 2017 года.**